Газета дзяржаўнай установы адукацыі "Грычынскі вучэбна-педагагічны комплекс яслі-сад –базавая школа"



# Перапынак!



Школа - гэта родны дом,
Дружна тут усе жывём,
Пра падзеі ў школьным свеце
Мы раскажам у газеце!

№6
Люты, 2022

## Чытайце ў нумары:

Вечар сустрэчы стар. 2

Акцыя "Сябруем з законам" стар.3

Афганістан - ты боль маёй душы стар. 4

Дзень Абаронцаў Айчыны стар. 5

Весткі з дзіцячага сада стар. 6

# *Вечар сустрэчы сяброў!*

Вечар сустрэчы выпускнікоў – гэта важная і цікавая падзея для ўсіх запрошаных на яго людзей. Убачыць сваіх аднакласнікаў і аднакласніц праз некалькі гадоў, пагаварыць (магчыма ўпершыню за доўгі час) з суседзямі па парце не адмовіцца ніхто.

На жаль і ў гэтым годзе вечар сустрэчы прайшоў у форме “Дзень адкрытых дзвярэй”. Кожны жадаючы мог прыйсці і пагутарыць са сваімі класнымі кіраўнікамі і сябрамі. Вучні ж у сваю чаргу падрыхтавалі канцэртную праграму, якую можна паглядзець на сайце, тэлеграм-канале і Youtube-канале нашай ўстановы. А таксама арганізавалі выставу фотаздымкаў выпускнікоў юбілейных гадоў: **1982, 1987, 1992, 1997, 2002, 2007, 2012, 2017, 2021**











# Акцыя “Сябруем з законам”

Штогод у рамках мерапрыемстваў па прафілактыцы безнагляднасці, правапарушэнняў непаўналетніх і абароне іх правоў і законных інтарэсаў праводзіцца акцыя “Сябруем з законам”. Яе мэта - гэта павышэнне бяспекі дзяцей, фарміраванне ў іх свядомых законапаслухмяных паводзін, патрыятычных пачуццяў, маральных каштоўнасцей, прапаганда адказнага бацькоўства, папярэджанне нашчасных выпадкаў з удзелам непаўналетніх і нш. У рамках гэтай акцыі прайшло шмат мерапрыемстваў з удзелам дзяцей, педагогаў, бацькоў, прадстаўнікоў зацікаўленных структур і ведамстваў.
















# Афганістан – ты боль маёй душы

И помним все войну, Афганистан,
И день чтим этот вывода военных.
Нам не забыть, конечно, ни потерь, ни ран,
Ни всех убитых, затерявшихся и пленных.

Сышла ў гісторыю афганская вайна. Але яшчэ доўга будуць трывожыць ўсіх нас галасы загінуўшых і жывых. Дзесяць страшных гадоў працягвалася вайна ў Афганістане, тады гэта называлася «выкананнем інтэрнацыянальнага абавязку». Незагойная рана – Афганістан. Для тых, хто страціў блізкіх, для тых, чыё юнацтва апынулася абпаленай вайной і гарачым афганскім сонцам. Вайна даўно скончылася, але боль страт-гэта жывая боль, яна на ўсё астатняе жыццё.



У нашай установе, як і ва ўсёй краіне прайло шмат мерапрыемстваў, якія былі прысвечаны гэтай даце.






# *Дзень Абаронцаў Айчыны*

Свята ўсіх нашых салдат –
 Вось што значыць гэты дзень!
Дзень абаронцаў адважных
Ды і проста ўсіх людзей!

23 лютага - Дзень абаронцаў Айчыны - прысвечаны тым, хто калісьці ў баі адстойваў свабоду сваёй Радзімы і гінуў за яе, тым, хто цяпер ахоўвае нашы межы, і тым, каму яшчэ трэба будзе стаць абаронцам Айчыны. Гэтаму святу і былі прысвечаны шматлікія мерапрыемствы.













# Весткі з дзіцячага сада

Апошні месяц зімы выдаўся вельмі багатым на падзеі. Мы разбіраліся “Што мы ведаем аб законе?”, успаміналі аб Афганістане, адзначалі Дзень Роднай Мовы, удзельнічалі ў раённым чэленджы “Азбука спорту” і вядома ж весела гулялі









